# ДА ПЫТАННЯ АБ ЭКСПАНАВАННІ МУЗЕЙНЫХ НУМІЗМАТЫЧНЫХ КАЛЕКЦЫЙ

**І. Н. Колабава,** *канд. гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Манеты і манетныя скарбы, з’яўляючыся помнікамі гісторыі і культуры, захоўваюць вялікі аб’ём інфармацыі аб сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных аспектах жыцця краіны.

Тэрыторыя Беларусі ўвогуле з’яўляецца ўнікальным рэгіёнам, дзе, пачынаючы са старажытных часоў, скрыжаваліся шматлікія гандлёвыя шляхі і адбываліся значныя ваенныя падзеі. Усё гэта спрыяла фарміраванню своеасаблівага складу мясцовага грашовага фонду, аб чым сведчыць і вялізарная колькасць манетных скарбаў, адкрытых на беларускіх землях.

Гісторыя буйнейшых еўрапейскіх музеяў сведчыць аб тым, што нумізматычным помнікам заўсёды адводзілася частка музейнай экспазіцыі. Манеты і манетныя скарбы прадстаўляюцца ў спецыяльных нумізматычных музеях (мюнцкабінетах) ці становяцца часткай экспазіцыі, прысвечанай гісторыі краіны. Прыкладам служаць знакамітыя музеі свету – Брытанскі музей, аддзел медалёў і старажытнасцей Парыжскай нацыянальнай бібліятэкі, Берлінскі мюнцкабінет, Венскі мюнцкабінет, Нумізматычны музей у Афінах, Нацыянальны музей у Празе, Нацыянальны музей у Кракаве, аддзел нумізматыкі Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве, аддзел нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу, музей Амерыканскага нумізматычнага таварыства ў Нью-Ёрку і інш. [6, с. 135–146].

Цікавасць да стварэння і экспанавання нумізматычных калекцый адзначаецца і ў гісторыі музейнай справы Беларусі. Можна ўзгадаць музеі пры статыстычных камітэтах, царкоўна-археалагічныя і іншыя музеі другой паловы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі. Цэнтрамі музейнага нумізматычнага збіральніцтва ў сучаснай Беларусі сталі Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, нумізматычны кабінет Белдзяржуніверсітэта, музейны фонд Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь захоўвае больш за 52 тыс. экзэмпляраў манет і 118 манетна-рэчавых скарбаў [1, с. 453]. Экспазіцыя нумізматычнага кабінета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – гэта сістэматызаваны збор манет з Антычнасці да сучаснасці, які налічвае каля 7 тыс. манет, а таксама 40 манетных скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі [4, с. 125]. У музейным фондзе Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь захоўваецца каля 20 манетна-рэчавых скарбаў [5, с. 5].

Значнымі нумізматычнымі калекцыямі валодаюць абласныя і раённыя музеі Беларусі. Нумізматычная калекцыя Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея складаецца больш чым з 18 тыс. адзінак захоўвання і больш за 20 манетна-рэчавых скарбаў. Нумізматычнай калекцыяй (каля 30 тыс. адзінак захоўвання) валодае і Магілёўскі абласны краязнаўчы музей [9, с. 39].

Прыкладам шырокага выкарыстання калекцый нумізматыкі і баністыкі ў экспазіцыі можа паслужыць Любанскі музей народнай славы [8, с. 359]. У кожным храналагічным раздзеле гістарычнай часткі экспазіцыі гэтага музея прадстаўлены вітрыны з адпаведнымі нумізматычнымі і баністычнымі помнікамі. Такі падыход узбагачае саму экспазіцыю і садзейнічае напаўненню ўсіх форм культурна-адукацыйнай работы музейнай установы цікавым фактычным і ілюстрацыйным матэрыялам. Трэба таксама адзначыць, што нумізматычная калекцыя гэтага музея добра апрацавана і нават зроблены каталог манетнага скарбу, што захоўваецца ў фондах.

Нумізматычныя помнікі прадстаўлены і ў шэрагу іншых раённых музеяў нашай краіны, напрыклад у Вілейскім краязнаўчым музеі [2, с. 170–171], Лідскім гісторыка-мастацкім музеі [3, с. 350].

Тым не менш шэраг раённых музеяў, што маюць нумізматычныя калекцыі, у экспазіцыі гэты ўнікальны матэрыял не выкарыстоўваюць. У прыватнасці, Барысаўскі аб’яднаны музей, які захоўвае цікавы нумізматычны збор, не прадстаўлены ў музейнай экспазіцыі, што адназначна зніжае магчымасці правядзення паўнавартаснай культурна-адукацыйнай дзейнасці [7, с. 84–86].

Нумізматычныя помнікі могуць быць прадстаўлены ў музейнай экспазіцыі па-рознаму, зыходзячы з пастаўленых задач і магчымасцей самога музея.

Класічным варыянтам з’яўляецца экспанаванне сістэматызаванага збору манет, які ахоплівае ўсе перыяды грашовага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абарачэння на тэрыторыі Беларусі. Такі падыход, зразумела, па сілах толькі спецыялізаваным нумізматычным музеям ці музею нацыянальнага ўзроўню.

Вельмі цікавым і відовішчным можа быць і іншы шлях – дэманстраванне скарбаў. Прыкладам можа служыць экспазіцыя музейнага фонду Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, дзе гісторыя грашовай гаспадаркі на тэрыторыі нашай краіны разглядаецца на скарбавым матэрыяле.

Магчыма і спалучэнне адзначаных прыёмаў. Экспазіцыя нумізматычнага кабінета Белдзяржуніверсітэта складаецца з дзвюх частак – паказу сістэматызаванага манетнага збору і калекцыі манетных і грашова-рэчавых скарбаў.

Манеты і манетныя скарбы могуць з’яўляцца і проста часткай гістарычнай экспазіцыі музея, узбагачаць яе інфарматыўнасць.

Падводзячы вынікі, трэба падкрэсліць, што нумізматычныя калекцыі не павінны быць мёртвым матэрыялам, яны маюць права на паўнавартаснае музейнае жыццё. Помнікі нумізматыкі павінны займаць сваё законнае месца ў музейнай экспазіцыі.


1. *Вечар, С. У.* Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі / С. У. Вечар // Музеі Беларусі: даведачнае выданне. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 452–457.

2. *Ганчар, С. М.* Вілейскі краязнаўчы музей / С. М. Ганчар // Музеі Беларусі: даведачнае выданне. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 170–171.

3. *Драб, Г. М.* Лідскі гісторыка-мастацкі музей / Г. М. Драб // Музеі Беларусі: даведачнае выданне. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 349–351.

4. *Колобова, И. Н.* Клады в собрании нумизматического кабинета Белорусского государственного университета / И. Н. Колобова // Rozwoj muzealnictwa i kolekcjonerstwa numizmatycznego – dawnej i dzis – na Bialorusi, Litwie, w Polsce i Ukraine: materialy z II Miedzynarodowej Konferencji Numizmatycznej. –Warszawa, 1997. – S. 125–126.

5. *Масько, И. Ф.* Задачи цэнтрального банка в сохранении историко-культурного наследия страны / И. Ф. Масько // Банкаўскі веснік. – 2003. –№ 31. – С. 5.

6. *Потин, В. М.* Введение в нумизматику / В. М. Потин // Труды Государственного Эрмитажа. – Л.: Искусство, 1986. – Т. 26. – Вып. 6. – С. 69–162.

7. *Раховіч, А. С.* Барысаўскі аб’яднаны музей / А. С. Раховіч // Музеі Беларусі: даведачнае выданне. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 84–86.

8. *Сіняк, Н. М.* Любанскі музей народнай славы / Н. М. Сіняк // Музеі Беларусі: даведачнае выданне. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 359–361.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Шталенков, И.* Редкие монеты Великого Княжества Литовского в белорусских коллекциях / И. Шталенков // Банкаўскі веснік. – 2003. – № 31. – С. 39–46.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ